УДК 821.161.3: 82-31

**В. Д. Жанкевіч**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Гімназія № 1 г. Баранавічы», Баранавічы*

# АДЛЮСТРАВАННЕ ЭКАЛАГІЧНЫХ КАТАСТРОФ У РАМАНЕ В. КАЗЬКО «НЕРУШ»

**Уводзіны.** Праблема ўзаемаадносін чалавека, прыроды і цывілізацыі адносіцца да вечных з прычыны сваёй шматграннасці і невычарпальнасці. Фактычна яна ўзнікла разам з homo sapiens, той часткай прыроднага свету, якая набыла самасвядомасць і магчымасці мэтанакіраванага пераўтварэння навакольнага асяроддзя. За тысячагоддзі свайго існавання чалавек значна змяніў аблічча сваёй планеты: скараціў раслiннае покрыва, вынішчыў мноства жывёл, акультываваў агромністыя прасторы. У XX ст. разбуральная дзейнасць чалавека дасягнула такіх катастрафічных маштабаў, што існаванне самога чалавека апынулася пад пагрозай. Атручанымі аказаліся вада, паветра, глеба… Але нягледзячы на пагрозу глабальнай экалагічнай катастрофы, людзі працягваюць знішчаць прыроду, хоць самі з'яўляюцца яе часткай. Гэта самы вялікі з абсурдаў нашай цывілізацыі, таму не дзіўна, што экалагічная праблематыка стала адной з найбольш універсальных у літаратуры. Прызнаны майстар слова В. Казько ў рамане «Неруш» раскрывае тэму ўзаемаадносін чалавека, прыроды і цывілізацыі на філасофскім, сацыяльным, этычным і эстэтычным узроўнях.

**Асноўная частка.** Актуалізацыя экалагічных праблем у другой палове XX ст. і заклапочанасць людзей станам навакольнага асяроддзя прывялі да ўзнікнення новай галіны літаратуры, якую называюць экалітаратурай.

Нягледзячы на тое, што праблема ўзаемаадносін чалавека і прыроды прысутнічае ў літаратуры здаўна (пачынаючы з міфаў і казак), выдзяляць яе ў асобную галіну культуры пачалі толькі ў другой палове мінулага стагоддзя. С. В. Грачышкіна ў артыкуле «К вопросу исследования современной литературы о природе: аспекты изучения литературы» трактуе тэрмін «экалітаратура» даволі шырока: «совокупность художественных и нехудожественных произведений, в которых автор делает акцент на взаимодействии человека с его окружающей средой» [1, с. 9].

Экалітаратура ахоплівае творы, у якіх аўтар вылучае на першы план ідэю ўзаемасувязі і ўзаемазалежнасці падзей у прыродным свеце, прызнае ўнутраную каштоўнасць не толькі чалавека, але і ўсяго прыроднага свету. Аўтар усведамляе пагрозу экалагічнай катастрофы і намагаецца знайсці аснову для гарманічнага існавання чалавека з астатнім прыродным светам.

У заходнім літаратуразнаўстве, якое раней, чым на постсавецкай прасторы, выявіла цікавасць да новай з'явы, існуе праблема наяўнасці даволі вялікай колькасці тэрмінаў для яго абазначэння: "environmental literature", "nature writing", "ecofiction", "ecological literature", "place-based literature", "nature-oriented literature", што стварае пэўную нязручнасць у навуковых даследаваннях.

Сярод адрозных рысаў экалітаратуры ў цэлым можна назваць экацэнтрысцкую перспектыву, прывязанасць да канкрэтнага месца на зямлі, уяўленне свету як сукупнасці узаемазвязаных суб'ектаў, заклапочанасць магчымасцю экалагічнай катастрофы. Гэтыя рысы з'яўляюцца вынікам цікавасці аўтараў да сучасных праблем. Прыродны свет іх цікавіць як надзелены сваёй унутранай вартасцю. Галоўнае ў экалітаратуры — сцвярджэнне вартасці і каштоўнасці прыроднага свету.

Цікавасць аўдыторыі да экалітаратуры абумоўлена спробай адшукаць асновы для ўстойлівага, экалагічна рацыянальнага існавання людзей. Адным з паказчыкаў павелічэння ўвагі да такой літаратуры з'яўляецца ўзнікненне экакрытыкі. Нягледзячы на тое, што актывізацыя цікавасць да літаратуры пра прыроду пачалася ў сярэдзіне мінулага стагоддзя, тэрмін «экакрытыка» быў упершыню выкарыстаны амерыканскім даследчыкам Уільямам Рукертам толькі ў 1978 годзе. Пад экакрытыкай звычайна разумеюць накірунак даследавання літаратуры пра прыроду, што ўзнік у канцы XX стагоддзя і выкарыстоўвае ідэі руху абаронцаў навакольнага асяроддзя. Аднак варта адзначыць, што часам гэты тэрмін разумеюць шырэй. У «Оксфардскім слоўніку літаратуразнаўчых тэрмінаў» экакрытыка вызначаецца як сфера даследавання не толькі літаратуры, але і культуры: «экакрытыка — гэта новае адгалінаванне ў сферы літаратурных і культуралагічных даследаванняў, якое ўзнікла ў 1980-х — 1990-х гадах і прысвечана вывучэнню адносін паміж літаратурай і прыродным светам і разгляду літаратурных твораў у святле экалагічнай праблематыкі» [2]. Экакрытыка — гэта пэўны падыход, а не канкрэтны метад даследавання. Разнароднасць даследаванняў у галіне экакрытыкі абумоўліваецца, па-першае, самімі аб'ектам даследавання; па-другое, разнастайнасцю метадаў; па-трэцяе, тэндэнцыяй міжкультурнага і міжэтнічнага ўзаемадзеяння даследчыкаў.

У той час, як на Захадзе экакрытыка з'яўляецца даволі развітай галіной літаратуразнаўства, дзе прысутнічае вялікая колькасць навуковых работ, выдаюцца зборнікі і анталогіі, існуюць асацыяцыі, што аб'ядноўваюць навукоўцаў, якія працуюць у гэтым накірунку; на постсавецкай прасторы існуюць пакуль

© Жанкевіч В. Д., 2019

Рэпазіторый БарДУ

толькі асобныя такія даследаванні, але цікавасць да яе, бясспрэчна, узрастае. Сярод работ беларускіх навукоўцаў, якія даследуюць паказ узаемаадносін чалавека і прыроды ў айчыннай і замежнай літаратурах, варта вылучыць дысертацыі А. І. Бельскага, В. У. Гніламёдавай, артыкулы І. А. Бурдзялёвай, М. С. Рагачэўскай, А. Жардзецкай і іншых, цыкл лекцый П. В. Васючэнкі і г. д.

Беларускае класічнае мастацтва ў значнай ступені захоўвае сутнасць традыцыйнай беларускай культуры, для якой была характэрна сінтэтычная інтэрпрэтацыя адносін чалавека і прыроды. У ранніх літаратурных помніках Беларусі жыццё прыроды трактуецца як арганічная частка чалавечага лёсу: асноўныя падзеі сялянскага жыцця звязаны з земляробчымі работамі і часам проста дыктуюцца прыроднымі з'явамі, якія становяцца важнымі фактарамі сацыяльных працэсаў. Беларуская экалітаратура мае даўнія традыцыі. Праявы экалагічнага мыслення можна знайсці ў такіх творах класікаў, як «Песня пра зубра» Міколы Гусоўскага, «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» Яна Баршчэўскага, «Новая зямля» Якуба Коласа, «Яна і я» Янкі Купалы, раманным цыкле «Палеская хроніка» Івана Мележа і іншых узорах айчыннай класікі. У сучаснай беларускай літаратуры тэма «чалавек і прырода» шырока прадстаўлена ва ўсіх жанрах.

У востра канфліктнай, экспрэсіўнай форме канцэпцыя пракаветнага і зруйнаванага Эдэму развіваецца ў рамане В. Казько «Неруш» (1981). Адлюстраванне беларускага Палесся, яго прыроды, асаблівасцей народнага жыцця і культуры гэтага рэгіёна у спалучэнні са зваротам да старажытнай натурфіласофскай сімволікі, замацаванай у нацыянальнай міфалагічнай традыцыі, займае адметнае месца ў разгледжаным рамане. Традыцыйная ўніверсальная тэма «чалавек-прырода» з'яўляецца ў творчасці В. Казько адной з галоўных і звязана, перш за усё, з актуальнай у час паскоранага навукова-тэхнічнага развіцця праблемай выхавання экалагічнай свядомасці людзей. Пісьменнік даводзіць, што гібель прыроды, варварскія адносіны да яе знішчаюць нешта чалавечае ў самім чалавеку, выступае не толькі за чысціню прыроды, але і за чысціню чалавечых адносінаў, мар, ідэалаў. Нягледзячы на значнае месца экалагічных матываў у рамане, В. Казько не з'яўляецца абаронцам навакольнага асяроддзя ў традыцыйным, вузкім разуменні гэтага паняцця. Чыста экалагічныя праблемы ўваходзяць у поле ўвагі аўтара, але не займаюць у ім цэнтральнае месца. В. Казько разглядае тэму ўзаемадачыненняў чалавека і прыроды найбольш у агульнаэстэтычным, маральным і філасофскім ракурсе.

Адлюстроўваючы свае натурфіласофскія і экалагічныя погляды, пісьменнік сцвярджае старажытную думку пра ўзаемазалежнасць і еднасць ўсяго існага, пра непарыўную сувязь чалавека з зямлёй і нацыянальнымі каранямі. Разрыў гэтай сувязі, адрыў чалавека ад зямлі ўспрымаецца пісьменнікам як экзістэнцыяльная трагедыя. Пакуль чалавек памятаў, што з'яўляецца часткай прыроды, наваколле дапамагала і аберагала, ён жыў у гармоніі са светам. Аднак варта было чалавеку адчуць сябе царом прыроды, стаць творцам і ахвярай навукова-тэхнічнага прагрэсу, як адразу ж давялося сутыкнуцца з такімі наступствамі, як прыродныя катаклізмы і экалагічныя катастрофы. В. Казько адлюстраваў страту адзінства чалавека і сусвету, страту першароднага пачуцця, якое дазваляла адчуваць сябе часцінкай прыроды.

Матыў разбурэння прыроды з'яўляецца цэнтральным у рамане «Неруш». Мастацкая свядомасць аўтара фіксуе глыбокую і непарыўную сувязь паміж экалагічнымі каштоўнасцямі і каштоўнасцямі, якія характарызуюць стан чалавечага духу. Разбураная прырода становіцца сімвалам разбуранай душы. Знішчаючы прыроду, людзі знішчаюць сябе. Чалавек, які не адчувае адказнасці за стан прыроднага наваколля, разрываючы свае сувязі з прыродай, становіцца спустошаным, страчвае адчуванне сябе. Пісьменнік папярэджвае не толькі пра верагоднасць крызісу экалагічнага, але, перш за ўсё, пра непазбежнасць крызісу экзістэнцыяльнага, таму што чалавек, які страціў сувязь з прыродай і дазваляе сабе бяздушныя адносіны да ўласнага дома, ператвараецца ў спажыўца, становіцца жорсткім і абыякавым да іншых людзей і наступных пакаленняў.

В. Казько шырока выкарыстоўвае міфалагічныя сюжэты і вобразы, што нярэдка абумоўлівае і наяўнасць другога, ірэальнага плана апавядання. У выніку страты пачуцця адзінства з прыродай, чалавек перастаў яе адчуваць, спасцігаць, разумець — а таму нарадзіўся страх, бо ўсё незразумелае, нерэальнае, загадкавае палохае. Катастрафічны стан навакольнага асяроддзя і трагічнасць падзей у прозе В. Казько падштурхоўвае галоўных герояў да самарэфлексіі і пераасэнсавання жыццёвых поглядаў і вопыту.

**Заключэнне.** Творчасць В. Казько можна разглядаць як пераканаўчае мастацкае сведчанне той неспрыяльнай духоўна-экалагічнай сітуацыі, што склалася на мяжы XX-XXI стагоддзяў. В. Казько як ніхто ў беларускай і еўрапейскай літаратуры адлюстраваў страту адзінства чалавека і сусвету, страту першароднага пачуцця, якое дазваляла адчуваць сябе часткай прыроды. У нейкай ступені ён вярнуўся да біблейскага ўспрыняцця ўзаемаадносін чалавека і прыроды, падкрэсліўшы іх непарыўны сімбіёз. Пісьменнік ставіць пытанні і шукае адказы на актуальныя выклікі часу, звяртаецца да духоўнага патэнцыялу нацыі, да творчага сінтэзу гісторыі і сучаснасці. Сваімі яскравымі творамі В. Казько яшчэ раз нагадвае, што беларуская літаратура можа быць цікавай і неабходнай свету як мастацтва нацыянальна самабытнае.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. *Гречишкина, С. В.* К вопросу исследования современной литературы о природе: аспекты изучения эколитературы / С. В. Гречишкина // Вестн. Томск. гос. ун-та. — 2004. — № 387. — С. 8—14.

2. *Baldick, Ch.* Ecocriticism / Ch. Baldick // Oxford Reference Online [Electronic resource]. — 2016. — Mode of access: http: //www.oxfordreference.com/view/10.1093/acref/9780199208272.001.0001/acacr-9780199208272-e-359?rskey=lgepDw&result=351. — Date of access: 14.01.2018.




Репозиторий БарГУ